Будзь у курсе!

# У ВАГОНЧЫКУ НА СУСТРЭЧУ З КАЗКАЙ

**9 снежня адкрываецца папярэдні продаж білетаў на цягнік «Навагодні экспрэс» Дзіцячай чыгункі імя К. С. Заслонава. У першае навагодняе падарожжа ў цяперашнім святочным сезоне цягнік Дзіцячай чыгункі імя К. С. Заслонава адправіцца 24 снежня ў 12.40. Ён будзе курсіраваць у дні зімовых канікул, калядных і навагодніх свят з 24 снежня да 7 студзеня ўключна.**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, 24 снежня цягнік зробіць два рэйсы ў 12.40 і 16.00. 25, 26, 27 снежня і 2, 3 і 7 студзеня можна будзе здзейсніць вандроўку на «Навагоднім экспрэсе» ў 11.00, 12.40, 14.20 і 16.00. 31 снежня цягнік адправіцца са станцыі Заслонава ў 11.00, 12.40 і 14.20, а 1 студзеня — у 12.40, 14.20 і 16.00.

Пасажыры праедуць па маршруце ад станцыі Заслонава праз станцыю Піянерская да станцыі Сасновы Бор і назад. Час у дарозе складзе 1 гадзіну 30 хвілін.

Суправаджаць гасцей у цягніку будуць героі ўпадабаных казак, а на станцыі Сасновы Бор для дзяцей і іх бацькоў у гэтым сезоне Дзіцячая чыгунка сумесна з Мінскім Палацам культуры і спорту чыгуначнікаў падрыхтавалі тэатралізаванае прадстаўленне «У снежным царстве, у марознай дзяржаве». На лясной паляне яны сустрэнуцца з Дзедам Марозам, Снягуркай, Снегавіком, Нязнайкам, Карлсанам, Бабай Ягой і іншымі папулярнымі казачнымі персанажамі і героямі вядомых мультфільмаў.

Дзеці таксама змогуць пастраляць у ціры пластмасавымі шарыкамі, зрабіць фота на памяць з Дзедам Марозам і Снягуркай, пракаціцца на санках і поні, пакарміць жывёл у жывым кутку і загадаць жаданне, якое абавязкова збудзецца. Акрамя таго, будуць працаваць дзіцячыя каруселі, гандлёвыя пункты харчавання і цацак.

27 снежня ў Дзень нараджэння Беларускай чыгункі для юных пасажыраў «Навагодняга экспрэса» будзе арганізавана пазнавальная віктарына, прысвечаная гісторыі беларускай магістралі. У ёй змогуць прыняць удзел усе ахвотныя.

З мэтай захавання здароўя юных пасажыраў, прафілактыкі распаўсюджвання вірусных інфекцый, а таксама стварэння камфортных умоў праезду ў цягніку прадугледжана рассаджванне з улікам сацыяльнай дыстанцыі. Акрамя таго, на працягу ўсяго дня будзе праводзіцца санітарная апрацоўка рухомага саставу. Наведвальнікам Дзіцячай чыгункі неабходна абавязкова выконваць масачны рэжым. Продаж масак будзе арганізаваны на вакзале станцыі Заслонава.

Кошт святочнага падарожжа на «Навагоднім экспрэсе» складае 19 рублёў. Білеты з 9 снежня можна набыць праз інтэрнэт-сэрвіс ByCard, а таксама ў касе на вакзале станцыі Заслонава Дзіцячай чыгункі (пр-т Незалежнасці, 86) па аўторках—пятніцах з 9.00 да 17.00, у суботу з 9.00 да 17.30 (перапынак з 13.40 да 14.10). З 24 снежня білетная каса будзе ў рэжыме работы Дзіцячай чыгункі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**